УДК 351.855.3«19»=161.3

***У.П. Люкевіч***
*канд. філас. навук, дац., дац. каф. спартыўных дысцыплін*
*Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна*
e-mail: lucul@brsu.brest.by

# ФАРМІРАВАННЕ НАВУКІ ПРА СПОРТ У XX СТАГОДДЗІ: ГАЛОЎНЫЯ МЭТЫ І ЗАДАЧЫ

*Адносна працяглы час феномен спорту вывучаўся самымі рознымі навукамі. Такое становішча паспрыяла таму, што ў дадзенай галіне чалавечых ведаў былі напрацаваны адпаведныя тэорыі, назапашаны факты і фактары, створаны тэрміналагічны навуковы апарат. Аналізаваць праблемы спорту можна і неабходна ў суадносінах з агульнымі праблемамі функцыянавання грамадства ў цэлым. Пытанні «навошта», «чаму», «што з'яўляецца мэтай» і г.д. паўстаюць у якасці фундаментальных праблемаў чалавечага жыцця ўвогуле. Задаваць іх важна з антрапалагічнага пункту гледжання, таму што сацыяльная дзейнасць мае пэўны сэнс, накірунак і адказнасць. Заўсёды ў гісторыі чалавечага грамадства людзі пыталіся самі ў сябе: чаму мы як чалавечыя істоты з'яўляемся такімі дзіўнымі? Чаму мы заўсёды хочам ведаць больш і пастаянна павялічваем колькасць навуковай інфармацыі і ведаў? На працягу XX ст. адбываўся інтэнсіўны працэс вызначэння галоўных мэтаў і задач навукі аб спорце.*

## Уводзіны

Развіццё навуковых ведаў на працягу XX ст. значна пашырыла абсяг інфармацыйных вымярэнняў у самых розных накірунках даследніцкіх палёў. Калі такі феномен, як спорт, дасягае ўсё большага і большага сацыяльнага прызнання з боку чалавечай супольнасці і расце яго значнасць, то становіцца зразумелым навуковая зацікаўленасць у намаганнях пастаянна прадукаваць новыя веды. Такім чынам, натуральна паставіць фундаментальнае пытанне для перцэпцыйнага агляду па магчымасці ўсіх назапашаных комплексных навуковых ведаў у галіне спорту, на якіх падставах яны базіруюцца і ў чым заключаецца іх прызначэнне?

Тут могуць быць прааналізаваны самыя розныя велічыні, і ўсе яны патэнцыяльна з'яўляюцца адказам на гэтае пытанне. Усе яны будуць нараджаць і стымуляваць разнастайныя падыходы, прадукаваць шырокую вобласць распаўсюджвання тых аспектаў, што складаюць усебаковыя і па магчымасці вычарпальныя спробы адэкватнага ўспрымання. Хоць навуковыя веды аб спорце пачалі складацца ў адпаведную сістэму адносна нядаўна з храналагічнага пункту гледжання, гісторыя спартыўнай навукі, ці, больш дакладна, навукі аб фізічнай актыўнасці, альбо фізічнай адукацыі, можа быць прасочана ад пачатку XX ст., калі не браць пад увагу шматлікія інтэрпрэтацыі, якія былі дадзеныя некаторымі філосафамі і медыкамі да 1900 г. Раннія экскурсы прадугледжваюць больш шырокія варыяцыі ў пошуках адказу на пытанне: «Ці можа садзейнічаць лепшаму разуменню і ўспрыманню сённяшняга дня для навуковых ведаў пра спорт вызначэнне яшчэ болей рацыянальных падыходаў да характарыстыкі спорту як сацыяльнай з'явы?».

На ўзроўні фенаменалагічнай перцэпцыі існаванне размаітых сфер грамадскага побыту азначае размежаванне чалавечай адзінкі і сістэмы, спрыяе падзелу на выкананне роляў вонкавых і ўнутраных. Такое адрозненне паўстае як стратэгія, што запэўнівае знешні і ўнутраны раздзел працы, а таксама тыя яе накірункі, якія маюць дачыненне да ўзмацнення высілкаў праз магчымую ўнутраную арганізацыю, што функцыянуе паводле ўласных правільных і абавязковых законаў. Чым больш спорт арыентуецца на атрыманне найвышэйшых дасягненняў, тым больш ён павіннен арганізавацца паводле ўласных унутраных правілаў і адысці ад вонкавых праблемаў. Мэта максімальнай актыўнасці можа быць рэалізавана тады, калі ўсе правілы і нормы будуць падпарадкава-

ны спорту як прылады для сям'і і сяброў, культавых рытуалаў, групавых і пляменных спаборніцтваў.

**Навука пра спорт у гарызантальнай перспектыве**

Гарызантальная перспектыва бярэ пад увагу параўнальную велічыню. Гэта ў поўнай меры адносіцца да згаданага вышэй пытання і дае адказы па меншай меры па двух розных сацыякультурных накірунках, якія таксама могуць разглядацца ў якасці прыкладаў на сістэмах функцыянавання спорту ў некаторых дзяржавах. У працэсе збору інфармацыі для адказу на пытанне з пункту гледжання розных краін альбо разнастайных аспектаў, ідэяў ці рашэнняў, узроўні параўнання могуць павялічвацца велізарна. Карысць ад рэалізацыі параўнальнага падыходу заключаецца ў наступным:

1) атрыманне большай інфармацыі пра іншыя краіны і іх сістэмы функцыянавання спорту;

2) лепшае ўспрыманне і разуменне кожнай з сістэм;

3) перайманне ідэяў па ўдасканаленні функцыянавання спорту альбо новых імпульсаў у разглядзе той ці іншай праблемы ў гэтай галіне.

Такім чынам, параўнальныя даследаванні могуць дапамагчы дасягнуць добра абгрунтаванага і ўпэўненага адказу на галоўнае пытанне: як выглядае спорт з пункту гледжання сістэмы навуковых ведаў. Адказ на яго не можа быць абмежаваны аналізам толькі адной асобна ўзятай краіны. З таго часу, як рух, гульня і спорт сталі тыповым міжнародным феноменам, вельмі карысным і неабходным падаецца супрацоўніцтва ў акрэсленым накірунку з улікам шырокай міжнароднай параўнальнай перспектывы. Адказ на пытанне аб месцы спорта ў сістэме навуковых ведаў пераважна будзе складацца з аналізу прэзентаванай літаратуры, якая адносіцца да тэмы спорту. Нават калі працэс развіцця навукі аб спорце поўнасцю ўсталяваны і яна прызнана акадэмічнай дысцыплінай, гэтага яшчэ недастаткова. Атрыманыя веды адпаведна пашырэння навуковага поля ўступаюць у супярэчнасць з раней дасягнутымі вынікамі, і прывядзенне ў спраўны стан сваёй асабістай метатэорыі ў адносінах да дасягнення патрэбнага развіцця навуковага поля застаецца актуальным пытаннем.

Яшчэ адна заўвага, але не апошняя. Некаторыя спасылкі на футурыстычную велічыню могуць дапамагчы ў акрэсленні і вызначэнні мэты і задач навуковых ведаў аб спорце. Гэтая велічыня мае больш гіпатэтычную прыроду і не з'яўляецца ісцінай у апошняй інстанцыі. Тым не менш задача галіны вышэйшай адукацыі і навукоўцаў, якія працуюць на ўніверсітэцкім узроўні, – думаць наперад, развіваць перспектывы і працаваць на наступныя будучыя канцэпцыі, што базіруюцца на дакладных гістарычных ведах і на добра збалансаванай сённяшняй перцэпцыі.

Розныя велічыні спрыяюць прадукаванню думак і ідэй, што могуць стаць дапамогай у адносінах да працэсу напрацоўкі карысных адказаў, якія датычацца пытання «што ўключае ў сябе паняцце "спорт"?». У гэтым выпадку падтрымка стварэння метатэорыі навуковых ведаў аб спорце можа быць вынікам, які прадукуе далейшае развіццё ўжо нават цэлага акадэмічнага поля навуковых даследаванняў.

У дадзеным кантэксце «гістарычнае вымярэнне» не можа азначаць расцягнуты аналіз тэксту, дакументаў і літаратуры, якія маюць справу з мэтамі і задачамі навуковых ведаў. У аглядзе літаратуры ў межах папярэдняга абмеркавання прадугледжаны кароткі перагляд некаторых аспектаў навуковай тэорыі (метатэорыі) у спартыўнай літаратуры. Гэты кароткі агляд таксама дае некаторыя ідэі адносна шэрагу пазіцый у межах самой навуковай тэорыі ведаў аб спорце з пункту гледжання гістарычнай перспектывы.

У гэтым кароткім аналізе робіцца спроба ўключыць сюды часткі дакументаў, якія паказваюць развіццё спорту, спартыўнай адукацыі і навуковых ведаў на нацыянальным і міжнародным узроўні. Пры выкарыстанні гэтых выбраных тэкстаў можа зда-

вацца, што задачы і функцыянаванне навуковых ведаў не з'яўляюцца новымі адкрыццямі і што кожная праблема можа вывучацца ад больш ранніх пунктаў гледжання ў адносінах да сённяшняга стану рэчаў і магчымасці ўплываць на будучае развіццё азначанай галіны.

Як ужо падкрэслівалася вышэй, сістэма навуковых ведаў аб спорце стала фарміравацца адносна нядаўна, і таму гісторыя ў яе даволі кароткая. Найперш гістарычны экскурс можа быць звязаны з дзейнасцю найбуйнейшай на сёння арганізацыі ў свеце, а менавіта Міжнароднай рады спартыўнай навукі і фізічнай адукацыі (ICSSPE), якая была заснавана ў Парыжы ў 1958 г. Рада каардынуе працу даследчыкаў розных галін спорту, развівае пэўныя кірункі спартыўнай навукі і фізічнай адукацыі. Сёння Рада прадстаўляе з сябе як міжнародную арганізацыю, што мае яскрава вызначаны параўнальны профіль у адпаведнасці са сваімі мэтамі і структурай. ICSSPE стварыла рэгіянальныя бюро ў Афрыцы, Азіі, у арабскіх краінах, Аўстраліі і Акіяніі, ва Усходняй Еўропе, у Лацінскай Амерыцы, Паўночнай Амерыцы і Заходняй Еўропе. Галоўнай мэтай Рады з'яўляецца стварэнне такой міжнароднай арганізацыі, якая б канцэнтравала ў сабе стратэгію спрыяння і набыцця новых навуковых ведаў, распаўсюджвала б іх вынікі, а таксама была накіравана на пошукі іншых даследніцкіх палёў спартыўнай навукі і іх практычнай рэалізацыі ў культурна-адукацыйным кантэксце. Да мэтаў ICSSPE адносяцца таксама: 1) садзейнічанне ў распаўсюджванні чалавечых каштоўнасцей, якія ўласцівы спорту; 2) паляпшэнне здароўя і павышэнне ўзроўню спартыўнай актыўнасці; 3) развіццё фізічнай адукацыі і спорту ва ўсіх краінах. На шляху да гэтых мэтаў Рада дапамагае абараняць і развіваць канцэпцыю Fair play і спартыўнай этыкі і садзейнічае міру і ўзаемапаразуменню паміж людзьмі. Як міжнародная арганізацыя, ICSSPE спрабуе наладзіць адносіны паміж развітымі краінамі і дзяржавамі, якія развіваюцца, а таксама садзейнічаць супрацоўніцтву навукоўцаў і арганізацый з усяго свету [1, p. 4–5].

Асноўнымі задачамі Міжнароднай рады спартыўнай навукі і фізічнай адукацыі з'яўляюцца наступныя:

1) падтрымка міжнароднага супрацоўніцтва ў сферы спартыўнай навукі;

2) садзейнічанне, стымуляванне і каардынацыя навуковых даследаванняў у сферы фізічнай адукацыі і спорту паўсюль на свеце і падтрымка ў рэалізацыі іх вынікаў у разнастайных сферах спорту на практыцы;

3) укараненне навуковых ведаў аб спорце і іх практычная рэалізацыя даступнымі для ўсіх зацікаўленых нацыянальных і міжнародных арганізацый і інстытутаў спартыўнай навукі (асабліва гэта адносіцца да краін, якія развіваюцца);

4) падтрымка і выкананне Міжнароднай хартыі фізічнай адукацыі і спорту, якая ўхвалена 20-й Генеральнай канферэнцыяй UNESCO (арт. 2);

5) садзейнічанне дыферэнцыяцыі ў спартыўнай навуцы і ў той жа час спрыянне інтэграцыі ў развітых галінах [2].

Каб вырашыць гэтыя задачы, ICSSPE імкнецца падтрымліваць і развіваць каардынацыю, якая датычыцца дзейнасці ў сферы навукі аб спорце па зборы, аналізе і распаўсюджванні ведаў у галіне спартыўнай навукі і спартыўнай практыкі. Немалая ўвага надаецца ініцыяванню, каардынацыі і арганізацыі міжнародных канферэнцый, сімпозіўмаў, сходаў і семінараў. Падтрымліваюцца і ініцыююцца праекты, што адносяцца да сферы трэнінгу і фізічнай адукацыі. Тое ж самае датычыцца праектаў па ўдасканаленні спартыўнай экіпіроўкі і інвентару. Павышаецца таксама значэнне супрацоўніцтва паміж установамі вышэйшай адукацыі і даследчыкамі ў галіне спорта і фізічнай адукацыі. Разам з гэтым узрастае роля інфарматыўнасці і дакументацыі ў спартыўнай навуцы, а таксама тых зменаў, што адбываюцца на ўзроўні нацыянальных інстытутаў. Стымулюецца апублікаванне вынікаў даследаванняў па спартыўнай навуцы, заахвочваюцца сродкі масавай інфармацыі, якія распаўсюджваюць гэтыя ідэі і вынікі. Нарэшце, вялікае

значэнне надаецца нацыянальным і міжнародным арганізацыям у сферы фізічнай адукацыі і спорту, спартыўнай навукі і іншых навук і маюць дачыненне да спорту [2]. Трэба таксама абавязкова дадаць, што ICSSPE працуе ў шчыльнай сувязі з UNESCO, WHO (Сусветная арганізацыя здароўя) і IOC (Міжнародны алімпійскі камітэт).

Такім чынам, гісторыя навукі аб спорце, хоць і з’яўляецца кароткай, але ўжо нават зараз дае магчымасць меркаваць пра пэўныя тэндэнцыі свайго развіцця, што праяўляецца ў працэсах дыферэнцыяцыі і інтэграцыі навук, якія маюць адносіны да спорту, на чым акцэнтуецца ўвага ў шматлікіх дакументах, матэрыялах і публікацыях.

Папярэдне рабілася заўвага наконт умоў, пры якіх параўнальная велічыня можа генераваць далейшыя навуковыя распрацоўкі мэтаў, задач і функцый сістэмы навуковых ведаў аб спорце. У параўнанні з даследніцкай парадыгмай яна можа быць выкарыстана пад рознымі сацыякультурнымі пунктамі гледжання – на такі працяглы тэрмін, на які, дарэчы, два розныя сацыякультурныя асяродкі падыходзяць да параўнання. Гэта робіцца магчымым пры выкарыстанні такой схемы, дзе напачатку тлумачыцца даследніцкая парадыгма. Такім чынам, гэта можа быць ужыта ў адносінах да мэтаў, задач і функцый сістэмы навуковых ведаў аб спорце.

Табліца. – Параўнанне як даследніцкая парадыгма [3, p. 28]

| РОЎНАСЦЬ | ПАДАБЕНСТВА | АДРОЗНЕННЕ |
|---|---|---|
| АДНОСНАСЦЬ | ПАРАМЕТРЫ ДЛЯ ПАРАЎНАННЯ | АБСАЛЮТНАСЦЬ (БЕЗУМОЎНАСЦЬ) |
| САМАПАРАЎНАННЕ | ПАРАЎНАННЕ З ДРУГІМ | ПАРАЎНАННЕ З ІНШЫМІ |
| МЭТЫ СПАРТЫЎНАЙ НАВУКІ НА МІЖНАРОДНЫМ УЗРОЎНІ | | |

| ВЕДЫ: | ПАРАЗУМЕННЕ: | КАМУНІКАЦЫЯ: | РАЗВІЦЦЁ: |
|---|---|---|---|
| Замежны спорт Спартыўная навука | Параўнальная спартыўная навука | Інтэрнацыянальная спартыўная навука | Развітая спартыўная навука |

З гэтай схемы вынікае, што ў параўнальнай даследніцкай парадыгме прымаюцца пад увагу многія аспекты. І асабліва важна зразумець, што даследаванні на міжнародным узроўні з’яўляюцца нечым большым, чым простае параўнанне. Веды як узор (замежная спартыўная навука) папярэднічаюць разуменню мадэлі (параўнальная спартыўная навука). Сувязь і развіццё ўзору можа фіксавацца ў якасці спецыяльнай задачы. У межах гэтага кароткага агляду параўнальнага вымярэння абмеркаванне мэтаў, задач і функцый спартыўнай навукі ў ЗША дае пэўны прыклад, які ажыццяўляецца ў межах т.зв. замежнай спартыўнай навукі. Параўнальнае вымярэнне адносна тэмы (прадмета, тэматыкі), мэтаў, задач і функцый спартыўнай навукі могуць быць лепш зразумелымі, калі да іх дастасуецца аналіз адпаведнага становішча, напрыклад, у сучаснай Беларусі.

Мэты, задачы і функцыі спартыўнай навукі ў ЗША абмяркоўваюцца пераважна ў часопісах «Quest» і «The Academy Papers». М.Ф. Хэнры, галоўны аўтарытэт у галіне фізічнай адукацыі ў ЗША, заўважыў: як акадэмічная дысцыпліна фізічная адукацыя існавала не заўсёды, але само жыццё змусіла вынайсці яе [4, p. 277–282]. Працяглы час яшчэ дыскутавалася пытанне, ці ёсць нешта падобнае на такую акадэмічную дысцыпліну, як фізічная адукацыя? Р. Эбэрнэці і М. Вальц разглядаюць галоўную функцыю фізічнай адукацыі як акадэмічнай дысцыпліны падчас заняткаў гуманістычнага зместу і суадносяць яе з катэгорыямі фізічных абмежаванняў, рухавых дасведчанняў, структуры асобы, персанальнага ўспрымання і сацыякультурнага асяроддзя [5, s. 179–186].

С. Кляйнман мяркуе, што тэорыя фізічнай адукацыі не можа быць абмежаванай, і структура руху, гульні і спорту не павінна выглядаць вузкай і фіксаванай [6, p. 29–34]. Ён з'яўляецца прыхільнікам адкрытай дыскусіі аб спартыўнай навуцы. С.Л. Грындорфэр прытрымліваецца той думкі, што шлях да спецыялізацыі і фрагментарызацыі спартыўнай навукі робіць інтэграцыйную канцэпцыю немагчымай [7, p. 36–64], а ў Д.А. Роўза пераважае пункт гледжання на будучы накірунак спартыўнай навукі ў міждысцыплінарным аспекце як даследніцка арыентаваную канцэпцыю з выкарыстаннем паняцця «рух» у значэнні экспрэсіі і, адпаведна, як ядро навуковых ведаў аб спорце [8, p. 1–21].

Калі зрабіць некаторыя высновы адносна даследаванняў навукоўцаў ЗША, то зразумела, што функцыі навуковых ведаў аб спорце рэфармаваны ў дачыненні даследніцкіх падыходаў у напрамку пазнання навакольнага асяроддзя такім чынам, каб вызначыць яго разнастайнасць, яго экалагічную рэчаіснасць і г.д. Спартыўная навука звяртаецца больш да даследаванняў у інтэграцыйным накірунку, і, такім чынам, з'яўляецца магчымасць атрымаць вынікі больш блізкія да рэальнасці ў межах даследніцкага працэсу. Увогуле, мэты, задачы і функцыі спартыўнай навукі фарміруюцца у значнай ступені пад крытэрыямі гнуткасці, блізкасці да рэальнасці, паглыбленага, а не толькі спецыфічнага падыходу, сацыяльнага вопыту, доўгатэрміновых эфектаў, грамадскай адказнасці і ўнёску ў адносінах да спрыяння развіцця гуманізму. Гэтыя фрагментарныя аспекты навуковай дзейнасці ў ЗША маюць значэнне для спартыўнай навукі ў тым сэнсе, што дазваляюць зрабіць супастаўленне з ідэямі развіцця ў асобна ўзятай краіне адносна тэматыкі мэтаў, задач і функцый спартыўнай навукі і, такім чынам, выкарыстаць параўнальны падыход.

Зразумела, што параўнальны падыход можа быць здзейснены таксама ў іншых кірунках спартыўнай навукі ў адносінах да сістэмы чалавечых ведаў (даследніцкая метадалогія, пераход ад тэорыі да практыкі). Параўнальныя вымярэнні ў дадзеным падыходзе патрэбны для таго, каб акцэнтаваць увагу на іх парадыгматычным характары. Мэты, задачы і функцыі спартыўнай навукі – тэма для апісання чатырох станаў спорту і сістэмы навуковых ведаў аб спорце (гістарычны, параўнальны, сучасны і будучы) з іх спецыфічнымі рысамі і агульнымі прыкметамі.

Варта таксама дадаць, што мэты і задачы навуковых ведаў аб спорце часткова выкладзены ў «Еўрапейскай спартыўнай хартыі», дзе асабліва моцна падкрэсліваецца важнасць спартыўнага і жыццяздольнага развіцця. Такі падыход павінен быць здзейснены на падставе забеспячэння і паляпшэння нацыянальнага фізічнага, сацыяльнага і інтэлектуальнага дабрабыту і міжгенерацыйнай трансляцыі асноўных вітальных прынцыпаў функцыянавання грамадства. У прыватнасці, гэта датычыцца фарміравання адпаведных структур і сродкаў для патрэб напрацоўкі, назапашвання і распаўсюджвання адпаведнай інфармацыі адносна спорту на лакальным, нацыянальным і міжнародным узроўнях. Навуковае шматаспектнае даследаванне спорту павінна няўхільна развівацца, у выніку чаго рэалізацыя атрыманых дадзеных будзе спрыяць абмену інфармацыяй паміж усімі зацікаўленымі структурамі [9].

**Заключэнне**

Калі паспрабаваць прасачыць, як функцыянуе сучасны спорт, а таксама прааналізаваць значэнне спорту як асаблівай аўтаномнай сістэмы, то перадусім прыйдзецца звярнуцца да наступных трох асноўных узроўняў: культурнага, сацыяльна-структурнага і персанальнага.

Акрэсленне культурнага ўзроўню абазначае тое, што спорт з'яўляецца арганізаваным у адпаведнасці з уласнымі ўнутранымі абавязацельствамі і нормамі, якія дзейнічаюць толькі ў яго сферы. Гэта, па-першае, азначае, што спорт выдзяляецца з сацыяльнага кантэксту і варункаў, якія ўстанавілі жыццё чалавека, ён прагне быць у адносінах

да іх нейтральным, імкнецца да таго, каб яго зразумелі як сімвалічны тэст. Ён выступае без такіх выпадковых дэфармацыяў грамадскага жыцця, як прыналежнасць да цывільнага стану альбо сацыяльнай групы, знешняга выгляду, колеру скуры, палітычных поглядаў і г.д. Спартсмен не з’яўляецца адначасова суседам, членам сям’і, членам рэлігійнай арганізацыі, нацыянальнай групы перш за ўсё таму, што ў іншых сістэмах ён не атлет, а толькі выконвае іншыя ролі, і яго спартыўная дзейнасць не выказвае ў той самы час палітычных, рэлігійных, мілітарных, сямейных і іншых функцыяў. Другая справа, калі спроба інтэрпрэтацыі спартыўнай актыўнасці атлета вымагае ўлічваць менавіта адзначаныя вышэй функцыі. Інстытуцыйная аўтаномія абазначае тое, што адбываецца ў спорце і застаецца без наступстваў для іншых галінаў побытавага жыцця. Напрыклад, калі нейкая супольнасць падзяляецца на разнастайныя групы (сям’я, царква, дзяржава), што кіруюцца ўласнымі мэтамі і інтарэсамі, то яна перад усім арганізавана згодна з уласнымі ўнутранымі прадпісаннямі. З гэтага вынікае тое, што статус, грамадскі прэстыж, правы і абавязкі, якія дасягаюцца ў дадзенай галіне, у іншай сферы маюць рэлятыўна меншае значэнне. Зразумела, што сацыяльна-структурны ўзровень мае блізкае дачыненне да персанальнага ўзроўню. Спорт можа перадаваць дасведчанне ў набыцці самасвядомасці і дапамагчы ў станаўленні іміджу. Сучасны чалавек успрымае спорт як такую актыўнасць, якая ўсталёўвае фармальныя правілы «роўнасці», што даюць магчымасць практычна кожнай асобе прыняць удзел у спаборніцтвах. Напрыклад, у тэнісе могуць спаборнічаць паміж сабой багатыя і бедныя, мужчыны і жанчыны, белыя і чорныя. У рэальнай жыццёвай дзейнасці існуе шмат сацыяльных сфераў, дзе падобнае супрацоўніцтва практычна немагчымае. Такая рыса спорту патрабуе пэўных намаганняў ад індывіда. Сам удзел у спаборніцтвах вымагае featureрознага ўзроўню ўменняў абстрагавацца ад грамадскіх варункаў, якія акрэсліваюць штодзённае жыццё, а таксама ўменняў змены роляў і прыняцця разнастайных пазіцыяў у адпаведна арганізаванай сістэме побыту. У спорце суб’ект сутыкаецца з прадстаўнікамі іншых сацыяльных слаёў, іншага полу, іншых этнічных групаў, размаітых прафесійных і грамадскіх пазіцыяў, якія ў звычайнай сістэме штодзённага жыцця раздзяляе сацыяльна-эканамічная няроўнасць.

Спорт у сістэме грамадскіх узаемасувязяў не з’яўляецца незалежным ад іншых сфер жыцця. Паміж імі існуюць шматлікія кантакты на самых розных узроўнях. Грамадская думка заўсёды ўважліва сочыць за элітай спорту. Ствараецца сітуацыя, калі паміж лепшымі атлетамі і іншымі сацыяльнымі групамі паўстаюць пэўныя адносіны. Інтэнсіўныя трэніроўкі вядуць да канкурэнцыі, напрыклад, з вучобаю, набыццём прафесіі. Прага да перамогаў у спорце абцяжарвае ў пэўных акалічнасцях дасягненне поспехаў у прафесійнай кар’еры. Адарванасць ад дому ў маладыя гады часта перакрыжоўваецца з праблемамі ў працэсе выхавання, таму што сям’я і школа трактуюць яго іншым чынам. Зрэшты, школа з’яўляецца асабліва яскравым прыкладам канфліктнай сітуацыі ў адносінах да спорту. Праблема у тым, што маюцца дзве асноўныя пазіцыі ў дачыненні да яго. Першая кіруецца зададзенымі інстытуцыяльна нормамі паводзінаў: менавіта іх выканання чакаюць бацькі, што дзейнічаюць у розных формах санкцыяў; іншымі словамі, – гэта сістэмная арыентацыя. Другая звязаная з тым, што паводзіны ў адносінах да спартыўнай дзейнасці арыентаваны сутнасна і паводле інтарэсаў. Яны ўзбуджаюцца самім зместам справы і вымагаюць такіх паводзінаў, якія накіраваны на вырашэнне праблемы. Наступствы, што вынікаюць з гэтых формаў арыентацыі ў адносінах да спорта, выводзяцца з таго, якія дзеянні ў нашай сістэме каштоўнасцяў культуры з’яўляюцца прывілеяванымі, якія дыскрымінаванымі, якую пазіцыю на глебе таго ці іншага культурнага ладу маюць паасобныя прадметы. Шмат у чым тут справа датычыцца грамадскага статусу спорту і прафесіяналізацыі. Калі сацыяльны статус, які мае асоба ў грамадстве, вынікае з супрацоўніцтва шматлікіх кампанентаў (прафесія, даходы, этнічная прыналежнасць, поспех у спорце), тады можа быць неадпаведнасць да статусу, таму

што яго паасобныя кампаненты выглядаюць спрэчнымі. Яскравым прыкладам такога падыходу з'яўляецца вядомы спартсмен, які адначасова дыскрымінаваны як прадстаўнік пэўнай этнічнай групы (афраамерыканец альбо асоба каўказскай нацыянальнасці). У любым выпадку станаўленне навукі аб спорце на працягу XX ст. адносна галоўных мэтаў і задач з неабходнасцю ўключала ў сябе такія тэарэтычныя веды і практычныя навыкі, якія першапачаткова з'яўляліся напрацоўкамі ў іншых навуковых напрамках. Шматаспектная параўнальная даследніцкая парадыгма ў пэўным сэнсе адлюстроўвае разнастайныя магчымасці ў вызначэнні сутнасці дадзенага грамадскага феномену з улікам ягонага біясацыяльнага і гуманітаранага (гуманістычнага) патэнцыялу. Патрэбы, запыты і заклікі шырокіх колаў грамадства з неабходнасцю сфарміравалі даследніцкае поле навукі аб спорце.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ


1. ICSSPE: A Global Perspective, Sport Science and Physical Education. – Berlin : ICSSPE, 1998. – 16 p.
2. Statutes Bye-Laws. International Council of Sport Science and Physical Education. – Jyväskylä : University of Jyväskylä, 1997. – 68 p.
3. Haag, H. Theoretical Foundation of Sport Science as a Scientific Discipline. Contribution to a Philosophy (Meta-Theory) of Sport Science / H. Haag. – Schorndorf : Hofmann, 1994. – 167 p.
4. Henry, M. F. Physical Education. An Academic Discipline / M. F. Henry // Antology of Contemporary Readings ; ed.: S. Slusher, A. S. Lockhart. – Dubuque, 1970. – P. 277–282.
5. Abernathy, R. Systematische Wege zu einer Wissenschaft / R. Abernathy, V. Waltz, H. Haag // Die Leibeserziehung in den Vereinigten Staaten. – Schorndorf : Hofmann, 1970. – S. 179–186.
6. Kleinmann, S. Towards a Non-Theory of Sport / S. Kleinmann // Quest. – 1968. – № 10. – P. 29–34.
7. Greendorfer, S. L. Specialization, Fragmentation, Integration, Discipline, Profession: What is the Real Issue? / S. L Greendorfer // Quest. – 1987. – № 39. – P. 36–64.
8. Rose, D. A. Is there a Discipline of Physical Education? / D. A. Rose // Quest. – 1986. – № 38. – P. 1–21.
9. European Sports Charter. Recommendation № R (92) 13 REV. Council of Europe. Committee of Ministers (adopted by the Committee of Ministers' Deputies, May 16, 2001). – Strasbourg, 2001.


Рукапіс паступіў у рэдакцыю 21.02.2017

***Lukievic U.P.*** **Formation of Sport Science in the 20th Century: Main Objectives and Tasks**

*The phenomenon of sport has been studied by different sciences for a long period of time. In effect, it leads to formulation of certain theories, collection of specific factors and creation of scientific terminology in the corresponding field of science. To be able to analyze the problems of sports, one should look at them under the scope of the most common problems of functioning of society in general. Such questions as «why», «what for», «what is the purpose» and alike, have been perceived as fundamental problems of human life for a long time. It is important to set them from the anthropological point of view, because social activity makes certain sense, gives direction and responsibility. In the history of human society people have always wondered about why they, as human beings, are so surprising; why people always want to know more and constantly increase the number of scientific information and knowledge. Over the 20th century, there was an intensive process of definition of main objectives and problems of sports science.*